*Дадатак 1*

## Карта мікратапонімаў в. Лаўрышава і ваколіц




*Дадатак 2*

## Вуліцы-“сваякі” (Запатова і Старасёва)

Даўным-даўно (калі, ужо ніхто і не памятае), да брамы Лаўрышаўскага манастыра прыйшлі два браты. Мясцовым манахам яны прадставіліся як Язапат і Старась і наняліся пасвіць манастырскіх кароў. Старась пасяліўся ў вёсцы сярод тутэйшых сялян, што жылі паўз левым беразе Валоўкі. Язапат пабудаваўся асобна, на грудзе, які плаўна пераходзіў у раўніну, што распасціралася цераз ляда да бліжэйшага гаю.

Праз пэўны час браты ажаніліся, завялі дзяцей. Тыя, пасталеўшы, знайшлі свае палавінкі і пабудавалі хаты каля бацькоўскіх. Такая была тады завядзёнка: родным сяліцца побач. З цягам часу выраслі дзве вуліцы родзічаў: Язапатава радзіна і Старасёва.

І сёння ў вёсцы Лаўрышава існуюць вуліцы Запатова і Старасёва або Старое сяло. Час крыху змяніў назву месца пасялення родных Язапата (то літару адсячэ, то націск перакіне), але захаваў імёны братоў-пастухоў у гэтай легендзе.

Запісана М.А.Антончыкам ў 1990 г.
ў в. Лаўрышава ад Ф.І.Антончыка (1903–1995).

*Дадатак 3*

**Балонне**

*Дадатак 4*

**Грэбля**

*Дадатак 5*

**Закляшторкі**



*Дадатак 6*

**Міхалёўка**



*Дадатак 7*

**Вікач**

*Дадатак 8*

**Дуброва**

*Дадатак 9*

**Незвішча**

*Дадатак 10*

**Князь Нязвішча**

Яшчэ не збіралася ўставаць сонца, калі атрад коннікаў пакінуў сонны Наваградак. Наперадзе дружыны ехаў высакаваты, худы, з доўгімі, па плечы, светла-рыжаватымі валасамі, у вышытай золатам вопратцы князь Войшалк, сын літоўскага караля Міндоўга.

Праз некалькі гадзін, праехаўшы конна па беразе Валоўкі, яны трапілі ў Лаўрышава. Тутэйшыя сяляне толькі прачнуліся і, завіхаючыся ў будзённых клопатах, моўчкі глядзелі ўслед князю і дружыне, якія кіраваліся ў бок Нёмана.

Калі перайшлі яшчэ накрытую тоўстым лёдам раку, у пушчы заўважылі спачатку рэдзенькі, а потым клубамі паваліўшы дым з высокай елкі. Гэта літоўскі дазор згледзеў іх і падае знак сваім: “Нязваны госць на парозе!..”

Вясной таго ж года Войшалк зноў з’явіўся ў гэтых мясцінах. Каб ахрысціць тутэйшых літвінаў, заснаваў ля ракі манастыр. Аднак люд гэты быў няпросты. Нездарма ж іх паселішча, што было насупраць яго абіцелі, Гневічамі* празвалі. Гнеўныя, гордыя і вольналюбівыя людзі тут жывуць. Маўляў, прыйшоў нязвішча** на нашу зямлю…

…Шмат вады сплыло па Нёмане з таго часу, а месца, дзе калісьці князь Войшалк заснаваў свой манастыр, і сёння Незвішчамі называюць.

Запісана М.А. Антончыкам ў 1990 г.
ў в. Лаўрышава ад Ф.І.Антончыка (1903–1995).

---

* *Гневічы – старажытная назва сённяшняй вёскі Гнесічы.*

** *Нязвішча – чужы, някліканы ( нязваны) чалавек.*